Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-10-11

# Абрысы

Сёння а 16-й гадзіне ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбудзецца вечарына «Ёсць Чалавек. Ёсць свет і дабрыня...», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння беларускай паэтэсы Эдзі Агняцвет. Арганізатарамі імпрэзы выступілі Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі і Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. Падрыхтаваная таксама выстаўка «Гэта — і сэрца і розум, неба маё і зямля», на якой прадстаўлены зборнікі вершаў, публікацыі асобных твораў, перакладаў, самыя першыя выданні Э. Агняцвет.

Літаратурны музей Максіма Багдановіча ў Мінску запрашае ўзяць удзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Кніга новага жыцця», прысвечанай 100-годдзю адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў М. Багдановіча «Вянок». Канферэнцыя адбудзецца 26 лістапада. Плануецца абмеркаванне наступных кірункаў: «Творчая спадчына Максіма Багдановіча ў культурным і гістарычным кантэксце: рэцэпцыя, традыцыі, уплывы», «Уплыў М. Багдановіча на развіццё беларускага слоўнага мастацтва», «Творчасць Максіма Багдановіча ў дыялогу культур, моў, літаратур» ды іншыя.

Музей гісторыі горада Гомеля прапануе сваім наведвальнікам выстаўку «Беларуская маляванка». У экспазіцыі прадстаўленыя маляваныя дываны — унікальныя народныя творы. Гэты малявыдомы цяпер кірунак народнага мастацтва быў вельмі распаўсюджаны ў 1920 —1960 гг. На выстаўцы будзе прадстаўлена калекцыя беларускіх маляванак з фондаў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе», выкананых Я. Драздовічам, А. Кіш, Г. Кузаўковым. Выстаўка працуе да 10 лістапада.

Фотавыстаўка «Адценні свету» разгорнутая ў кінатэатры «Цэнтральны». У экспазіцыі прадстаўленыя творы Вольгі Аркадзьевай і Валянціны Анцыпавай. На фотаілюстрацыях — жыццё і побыт людзей розных краін і кантынентаў. «У кожным куточку нашай Зямлі можна ўбачыць тое, што прымушае сэрца біцца часцей, а душу — усміхацца: дзесьці незвычайныя людзі, дзесьці — прыгожыя краявіды і цікавы свет жывёл, дзесьці найцікавейшая архітэктура», — лічаць аўтары выстаўкі і прапануюць увазе гледачоў сваё бачанне свету.

"Літаратура і мастацтва". Абрысы